8. МПАА, экспедыцыя “Драгічын-2000”, пал. сш. 1, Л. 1-68
9. Палескае вяселле / уклад. і рэд. В.А. Захаравай. – Мн.: Універсітэцкае, 1984. – 303 с.
10. Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна. / уклад. І.Ф.Штэйнер, В.С.Новак. – Мн.: Неман, 2002. – 383 с.
11. Moszyński K. Polesie Wschodnie: Materjały etnograficzne ze wschodniej części powiatu mozyrskiego oraz z powiatu rzeczyckiego. – Warszawa: Wydawnictwo kasy im. Mianowskiego, 1928 – 328 s

УДК 130

# ПРАБЛЕМА СІМВАЛА Ў СУЧАСНАЙ МІЖКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

**С.М. Янчалоўская**
УО "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

В статье рассматривается роль символа в современных процессах межкультурной коммуникации. Символ определяется основным структурообразующим элементом культуры и средством осуществления взаимодействия её субъектов; сама культура — сложной многоуровневой символической системой. Современная коммуникация характеризуется десемантизацией и профанацией символической системы культуры.

In article the role of a symbol in modern processes of the intercultural communications is considered. The symbol is defined by the basic element creating structure of culture and means of realization of interaction of its subjects; culture — complex multilevel symbolical system. The modern communications is characterized loss of semantics and profanation of symbolical system of culture.

У сучасных гуманітарных ведах вылучаецца напрамак, што асэнсоўвае існаванне культуры як сімвалічнае быццё. Шэраг канцэпцый утвараюць галіну філасофіі культуры, дзе сімвал з'яўляецца цэнтральным элементам, прынцыпам, які фарміруе свет чалавека як свет культуры. Многія даследчыкі лічаць, што назапашаныя веды дазваляюць вызначыць спецыяльную навуку сімбалогію альбо сімвалазнаўства, якая вывучае сімвалічныя сістэмы культуры і выпрацоўвае тэарэтыка-метадалагічныя асновы для даследавання розных тыпаў культур [1, с. 7; 2, с. 427; 3, с. 18].

Сімвал у сімвалазнаўстве вызначаецца вельмі шырока — як сутнасць, спосаб і прынцып чалавечага быцця, што абумоўлівае будову культуры як складанай і шматузроўневай сімвалічнай сістэмы. Сімвал з'яўляецца сатруктураўтвараючым элементам узаемаадносін чалавека і сусвету, сродкам адаптацыі яго да акружаючай рэчаіснасці. Здольнасць чалавека да сімвалізацыі з'яўляецца неад'емнай умовай існавання культуры, паколькі праз сімвал чалавек надае значэнні ўсяму, што трапляе ў поле яго дзейнасці [4, с. 6–7; 5, с. 21].

У вузкім сэнсе сімвал раскрываецца як дыялектычная тоеснасць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

ідэі і матэрыі, сутнасці і з'явы, зместу і формы, дзе форма падпарадкоўваецца ў сваёй арганізацыі зместу. Сімвал у пачуццёва-успрымальнай форме выказвае, зберагае і трансліруе ідэі, асноватворчыя для функцыяніравання культуры. Сімвал валодае велізарнай сэнсавай насычанасцю, у яго форме ў сціснутым выглядзе, найбольш ёміста і эфектыўна, прадстаўлена ўся сутнасць сімвалізаванага [1, с. 8–9; 5, с. 33].

Адной з самых галоўных функцый сімвала ў культуры з'яўляецца камунікацыйная функцыя — абмен ідэямі і каштоўнасцямі як унутры, так і ў міжкультурных кантактах. Камунікацыйныя зносіны ў культуры ладзяцца на аснове сімвалаў, паколькі без аднолькавых агульных уяўленняў пра свет, змешчаных у семантычным полі сімвала, камунікацыя немагчыма. У кожнай культуры індывіды звязаны паміж сабой сімвалічнай сістэмай, а заключаная ў ёй інфармацыя мае агульназначную каштоўнасць для ўсіх членаў супольнасці [6, с. 51].

Міжкультурная камунікацыя засноўваецца на сімвалічным узаемадзеянні суб'ектаў, культурныя адрозненні каторых выяўляюцца ў раскрыцці зместу сімвалаў. Разуменне чужой культуры ўяўляе сабой пазнанне "іншых" сімвалічных кодаў, пераўтварэнне іх ў свае. Адным з састаўных працэсаў міжкультурнай камунікацыі з'яўляецца абмен сімваламі, калі, пранікаючы з адной культуры ў іншую, сімвал прыжываецца і становіцца адкрытым для інтэрпрэтацый. Сімвал дазваляе ўдзельнікам міжкультурнай камунікацыі ўваходзіць ў іншы сацыякультурны свет, зносіцца не толькі ў непасрэдным узаемадзеянні, але і скрозь час і прастору [5, с. 30–31].

Культура ўяўляе сабой сімвалічную сістэму, у якой акумулююцца ключавыя ідэі, каштоўнасці, нормы, што з'яўляюцца арыенцірамі для культуратворчасці пэўнага грамадства. Сімвалічная сістэма культуры — гэта сістэма ўзаемаабумоўленых элементаў: уласна сімвала, міфа і мовы, якія адпавядаюць розным узроўням быцця. На абстрактна-лагічным узроўні паняцце культуры вызначаецца як сімвал, на канкрэтна-гістарычным узроўні яе рэальнае ўвасабленне асэнсоўваецца як міф, на выразна-моўным узроўні прадстаўленне культуры ажыццяўляецца ў моўнай форме. Адпаведна, гісторыя культуры будуецца на сімвалічных прынцыпах як сістэма гісторыка-культурных міфаў, а гістарычны працэс вызначаецца як станаўленне сімвалічнага быцця ў міфе [2, с. 428].

Калі разглядаць змястоўны бок еўрапейскай культуры, то вылучэнне гісторыка-культурных тыпаў альбо міфаў ажыццяўляецца праз акцэнтаванне элементаў сімвала — ідэі альбо матэрыі. Культура, дзе на першым плане знаходзіцца матэрыяльна-рэчыўны бок сімвала, вызначаецца як язычніцкі міф Старажытнага свету. Тут сімвал праяўляецца ў рэчыўнай сферы матэрыяльнымі сродкамі, а ідэальнае



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

пераўтвараецца ў схему. Найбольш характэрным увасабленнем старажытнага міфа з'яўляецца рэлігійнае пакланенне з'явам прыроды, дзе атаясамліваюцца ідэальная і матэрыяльная сферы, але гэты сімвалізм не выходзіць за межы матэрыяльнай рэчыўнасці. Культура, дзе на першым плане знаходзіцца ідэальна-асобасны элемент сімвала, вызначаецца як хрысціянскі сярэднявечны міф. У ім тоеснасць ідэальнага і матэрыяльнага ўвасоблена ідэальнымі сродкамі, у матэрыі ён мае патрэбу толькі для дэманстрацыі. Таму культура хрысціянскага Сярэднявечча заснавана на перавазе духоўных і асобасных каштоўнасцяў. У культурах Антычнасці і Адраджэння ідэальны і матэрыяльны элементы сімвала ўраўнаважаны, але ў першым выпадку — як пераход ад матэрыяльнага да ідэальнага, у другім — ад ідэальнага да матэрыяльнага. Выкарыстанне ўнутры хрысціянскага ідэальна-асобаснага міфа таго ж сімвалічнага прынцыпа прыводзіць да вылучэння падтыпаў культуры: ідэальны хрысціянскі міф вызначаецца як праваслаўе, прынцыпова-сімвалічны — як каталіцтва, матэрыяльны — як пратэстанцтва. З пратэстанцкім матэрыяльным міфам у значнай ступені звязана далейшае развіццё новаеўрапейскай культуры: дамінуючыя ў хрысціянстве трансцэндэнтальныя каштоўнасці ператвараюцца ў суб'ектыўныя ідэі, суб'ект абсалютызуецца, сусвет успрымаецца як механізм, а Бог як абстракцыя [2, с. 429].

Калі разглядаць камунікацыйную функцыю культуры, то ў сімвале вылучаюцца элементы, якія ўтвараюць яго ўнутраны, альбо эзатэрычны бок і знешні, экзатэрычны бок сімвала. У гісторыі развіцця еўрапейскай культуры прасочваецца своеасаблівая дыялектыка эзатэрычнай и экзатэрычнай складаючых сімвала. У культурах Старажытнага свету пераважаў эзатэрычны бок сімвалаў — іх сакральны змест быў герметычным, вядомым толькі пасведчаным, што адасабняла адну сацыяльную групу ад іншых. Станаўленне сусветных рэлігій патрабавала шырокага распаўсюджвання рэлігійных ідэй, таму камунікацыйная роля сімвалаў змянілася. Сімвалы захоўвалі свой сакральны змест, але ён стаў даступным для ўсіх, незалежна ад сацыяльнай прыналежнасці. Тут праявілася дамінаванне эзатэрычнага боку сімвала. У Новы час у сімвале пачала пераважаць экзатэрычная складаючая. У культуры Адраджэння сімвал набыў статус гносеалагічнага і эстэтычнага фенамена, перастаў быць сродкам боскага адкрыцця і ўсё больш звязваўся з творчай дзейнасцю чалавека. У культуры Асветніцтва экзатэрычная складаючая сімвала пачала дамінаваць: ён стаў паняційна-рацыянальным спосабам выказвання пэўнага зместу. Далейшае развіццё еўрапейскай цывілізацыі ішло па шляху паступовай секулярызацыі духоўнага і сацыяльнага жыцця, узмацнення нігілізма, рацыяналізма і суб'ектывізма, што пацягнула за сабой працэс прафанацыі сімвала, які пастаянна паглыбляўся. У Навейшы час пад уціскам гісторыка-сацыяльных змен сімвалы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

губляюць (часткова альбо цалкам) свае культурна замацаваныя сэнсы, перастаюць разумецца ўдзельнікамі камунікацыі, але вонкавую форму старанна захоўваюць. Сімвал становіцца "пустой" формай для запаўнення любым зместам і інтэрпрэтуецца ў залежнасці ад кантэкста функцыяніравання. Адбываецца дэсемантызацыя сімвала — страта ім сваіх сімвалічных якасцей [1, с. 80; 6, с. 52].

Такім чынам, гістарычная перыядызацыя сімвалічнай сістэмы еўрапейскай культуры са змястоўнага і камунікацыйнага пунктаў гледжання адрозніваюцца. У змястоўным плане назіраецца чаргаванне элементаў сімвала: матэрыяльны (Старажытны свет) — ідэальны (Сярэднявечча) — матэрыяльны (Новы і Навейшы час). У камунікацыйным плане вылучаюцца два перыяды сімвалізму: эзатэрычны (Старажытны свет і Сярэднявечча) і экзатэрычны (Новы і Навейшы час). У сучаснай культуры спалучаюцца дзве крайнія пазіцыі — гэта матэрыяльна-экзатэрычны сімвалізм, які характарызуецца матэрыялізмам, рацыяналізмам, суб'ектывізмам, дэсемантызацыяй і прафанацыяй сімвалічнай сісітэмы культуры.

У сучасных сацыякультурных умовах пашырэнне працэса міжкультурнай камунікацыі садзейнічае больш глыбокаму ўзаемапазнанню і ўзаемаўзбагачэнню культур. Але карэннае ламанне традыцыйнай сімвалічнай сістэмы негатыўна ўплывае на культуру. Пад уздзеяннем глабалізацыі традыцыйныя сімвалічныя асновы страчваюцца і замяшчаюцца чужароднымі, што разбурае цэласнасць культуры, пагражае стратай ментальнай апоры чалавека. Кожная памылка сімвалічнага працэса з'яўляецца адменай свабоднага ажыццяўлення чалавека ў культуры: страта лінгвістычнай здольнасці, якая дазваляе арганічна думаць, ці недахоп лагічнай здольнасці, што зразумела прадстаўляе свет, — гэтыя перашкоды блакіруюць сімвалічнае існаванне культуры. Асаблівае значэнне мае праблема захавання ўласных сімвалічных межаў, сваёй самабытнасці пры гарманічным існаванні ў сусветнай культуры. Галоўнымі рысамі сучаснага грамадства з'яўляюцца масавы характар камунікацыі і глабалізацыя інфармацыйных працэсаў, што па-новаму структуруюць сімвалічнае функцыянаванне культуры.

Адным з элементаў міжкультурнай камунікацыі ў эпоху глабалізацыі стала экспансія заходняй культуры, сродкамі трансляцыі ідэй і каштоўнасцяў якой з'яўляюцца сімвалы. Яны выказваюць фундаментальныя для заходняга грамадства паняцці свабоды, роўнасці, справядлівасці, магутнасці, багацця, магчымасці ўвасаблення рэлігійнага і сацыяльнага ідэала на зямлі. Асноўным каналам сімвалічнай трансляцыі з'яўляецца масавая культура, арыентаваная на каштоўнасці грамадства спажывання. У пэўнай ступені яна паставіла



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

сімвалы на службу камерцыйным мэтам. Прыняцце гэтых сімвалаў пацягнула за сабой трансфармацыю традыцыйнага светаўспрымання, вобраза жыцця, сістэмы каштоўнасцяў і духоўных арыенціраў, сцвярджэнне лідэрства заходняй культуры.

У самасвядомасці айчыннай культуры спее праблема пошука сімвалаў, якія адлюстравалі сацыяльна-палітычныя і культурна-рэлігійныя патрэбнасці грамадства. Гэтыя сімвалы прызваны быць асновай для фарміравання новай сімвалічнай сістэмы культуры, духоўна-маральнай апорай для пераадольвання негатыўных з'яў сучаснасці. Іх пошук разгортваецца ў розных напрамках: звяртанне да язычніцкіх сімвалаў, рэлігійнага сімвалізма хрысціянства, палітычнай і патэрналістычнай сімволікі, усходняй рэлігійнай містыкі, сацыяльнай сімволікі заходняй культуры. Але асноўнымі крыніцамі такіх сімвалаў для айчыннай культуры павінны стаць рэлігійная сімволіка і ідэйна-каштоўнасныя пласты папярэдніх гістарычных перыядаў.

Літаратура


1. Мячикова, И.И. Методологические основы символиковедения/ И.И.Мячикова.— Мн.: БГЭУ, 2002.— 119 с.
2. Янчалоўская, С.М. Сімвалічная культурфіласофія як тэарэтыка-метадалагічная аснова даследавання культуры Беларусі/ С.М.Янчалоўская// Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе.— Гродно: ГрГУ, 2007.— С. 427–432.
3. Янчалоўская, С.М. Каштоўнасці беларускай культуры ў славянскім свеце/ С.М.Янчалоўская// Этыка і маральнасць у эпоху глабалізацыі.— Брэст: Альтернатива, 2008.— С. 18–24.
4. Кармадонов, О.А. Социология символа/ О.А.Кармадонов.— М.: Academia, 2004.— 352 с.
5. Тен, Ю.П. Символ в межкультурной коммуникации: автореф. дис. ... д-ра филос. наук: 090013/ Ю.П.Тен; ЮФУ.— Ростов-на-Дону, 2008.— 43 с.
6. Калацэй, В. Сімволіка камунікацыйных паводзін у традыцыйнай культуры Беларусі/ В.Калацэй, Э.К.Дарашэвіч// Символы в контексте культуры.— Мн.: БГЭУ, 2001.— С. 51–56.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ